

# З назначэннем!

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі — новы генеральны дырэктар. Ім стаў **Вадзім Гігін**, які ўзначальвае рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне "Беларускае таварыства «Веды»".

Вадзім Гігін — кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Мае больш чым 20-гадовы вопыт выкладання і навуковай дзейнасці. Працаваў галоўным рэдактарам часопіса "Беларуская думка", дэканам факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ. З'яўляецца членам калегій Міністэрства інфармацыі і Міністэрства адукацыі, уваходзіць у склад Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук, экспертнага савета па філасофіі, паліталогіі і сацыялогіі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

Прадстаўляючы новага генеральнага дырэктара калектыву, міністр культуры Анатолій Маркевіч адзначыў:

— Кіраваць "алмазам ведаў" — ганарова і адначасова вельмі адказна. Нацыянальная бібліятэка Беларусі — галоўная ўніверсальная навуковая бібліятэка краіны і сістэмаўтваральнае звяно яе адзінай бібліятэчнай прасторы, сімвал нашай дзяржавы.

Міністр звярнуў увагу, што пры арганізацыі работы Вадзіму Гігіну неабходна будзе вырашаць шэраг пытанняў. Сярод галоўных — кадравае забеспячэнне, умацаванне матэрыяльнай базы ўстановы, стварэнне аўтаматызаванай сістэмы "Электронная бібліятэка", метадычнае суправаджэнне і кантроль дзейнасці публічных бібліятэк краіны.